© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

УВАГА! *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.*

Дэманстрацыйны варыянт экзаменацыйнай (тэставай) работы
Геаграфія

Варыянт змяшчае 38 *заданняў і складаецца з часткі* А *(*16 *заданняў) і часткі* В *(*22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*


Частка А

У кожным заданні часткі А *толькі адзін з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

А1. Лікавы маштаб 1 : 20 000 000 адпавядае найменнаму маштабу:
1) у 1 см – 20 м;
2) у 1 см – 200 м;
3) у 1 см – 2 км;
4) у 1 см – 20 км;
5) у 1 см – 200 км.

А2. У межах старажытнага складкаватага пояса размешчаны(-а):
1) горы Альпы;
2) горы Гімалаі;
3) горы Кардыльеры;
4) Уральскія горы;
5) Бразільскае пласкагор'е.


А3. Выберыце ПРАВІЛЬНАЕ сцверджанне ў характарыстыцы кліматычных паказчыкаў на аснове прапанаванай кліматаграмы (для метэастанцыі Паўднёвага паўшар'я):



1) тэмпература паветра самага цёплага месяца не перавышае +20 °С;
2) абсалютны мінімум тэмпературы паветра адзначаецца ў снежні;
3) гадавая колькасць ападкаў складае каля 400 мм;
4) найбольшая колькасць ападкаў выпадае летам;
5) кліматаграма адпавядае ўмеранаму марскому тыпу клімату.

А4. Выберыце халоднае акіянічнае цячэнне з прапанаванага пераліку:
1) Курасіа;
2) Гальфстрым;
3) Заходніх Вятроў;
4) Паўднёвае Пасатнае;
5) Паўночна-Атлантычнае.

А5. Паказаная на фотаздымку расліна з'яўляецца тыповым прадстаўніком флоры:



1) гілей Паўднёвай Амерыкі;
2) саваннаў і рэдкалессяў Афрыкі;
3) паўпустынь і пустынь Паўночнай Амерыкі;
4) сухіх цвердалістых лясоў і хмызнякоў Аўстраліі;
5) вечназялёных цвердалістых лясоў і хмызнякоў Міжземнамор'я.

А6. Адзначце частку свету, якая найменш забяспечана рэсурсамі поўнага рачнога сцёку:


1) Азія; 2) Афрыка; 3) Аўстралія з Акіяніяй; 4) Амерыка; 5) Еўропа.

А7. Адзначце дзяржаву з федэратыўнай формай палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання:

1) Канада; 2) Егіпет; 3) Казахстан; 4) Літва; 5) Вялікабрытанія.

А8. Дзяржава, якая ў адпаведнасці з класіфікацыяй ААН уваходзіць у састаў рэгіёна Паўднёвая Азія, пазначана на картасхеме лічбай:

1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4; 5) 5.




А9. Адзначце дзяржаву з найбольш высокай удзельнай вагой гарадскога насельніцтва:

1) Індыя;
2) Японія;
3) Узбекістан;
4) Таджыкістан;
5) Польшча.

А10. Адзначце рад, у якім пералічана толькі прадукцыя машынабудавання:

1) стальныя трубы, станкі;
2) камп'ютары, гадзіннікі;
3) легкавыя аўтамабілі, гума;
4) ліставое шкло, дрот;
5) марскія судны, хімічныя валокны.

А11. Адзначце АГУЛЬНУЮ рысу, якая аб'ядноўвае выдзеленыя на карце дзяржавы:




1) унітарная форма палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання;
2) гаспадарка постіндустрыяльнага тыпу;
3) вядучыя краіны па аб'ёмах вытворчасці электраэнергіі;
4) вядучыя краіны – вытворцы марскіх суднаў;
5) краіны – лідары па пагалоўі буйной рагатай жывёлы.

А12. Адзначце дзяржаву, якая ўваходзіць у тройку сусветных лідараў па валавым зборы кукурузы:

1) ЗША; 2) Мексіка; 3) Расія; 4) Казахстан; 5) Егіпет.

А13. Тэктанічная структура, у межах якой размешчана Ашмянскае ўзвышша, на картасхеме пазначана лічбай:

1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4; 5) 5.



А14. Адзначце найбольш распаўсюджаную драбналістую пароду дрэў у лясах Беларусі:

1) дуб;
2) ясень;
3) ліпа;
4) клён;
5) бяроза.

А15. У характарыстыцы гаспадаркі Беларусі ПРАВІЛЬНЫМ з'яўляецца сцверджанне:

1) здабыча каменнай солі вядзецца выключна адкрытым спосабам;
2) каля паловы электраэнергіі выпрацоўваецца за кошт альтэрнатыўных крыніц энергіі;
3) вытворчасць азотных угнаенняў у краіне адносіцца да галін з сыравіннай арыентацыяй;
4) у структуры сельскагаспадарчых угоддзяў пераважаюць ворныя землі;
5) максімальная колькасць напрамкаў чыгунак у краіне сыходзіцца ў горадзе Гродна.

А16. Укажыце гісторыка-культурны аб'ект (гл. фотаздымкі), размешчаны ў Беларусі:

1)



2)



3)



4)



5)



Частка В

Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі В, *запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, указаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*


В1. Размясціце паслядоўна з поўначы на поўдзень наступныя геаграфічныя аб'екты:

1) астравы Новая Зеландыя;
2) возера Верхняе;
3) вадаспад Анхель;
4) масіў Вінсан;
5) горы Атлас.

Адказ запішыце лічбамі, захоўваючы атрыманую паслядоўнасць. Напрыклад: 21453.

В2. Укажыце пункт (сярод адзначаных на фрагменце плана мясцовасці кропкай з лічбай) з найбольшай абсалютнай вышынёй рэльефу.

Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1.



Суцэльныя гарызанталі праведзены праз 1 метр.

В3. Вызначэнне свайго месцазнаходжання ў навакольнай прасторы адносна бакоў гарызонту і мясцовых прадметаў – гэта … .

Дапоўніце сказ і запішыце адказ у выглядзе слова ў той форме, у якой яно павінна быць выкарыстана ў сказе.

В4. Устанавіце АДЗІНА ПРАВІЛЬНУЮ адпаведнасць:


Акіян	Мора, заліў
А) Ціхі Б) Індыйскі В) Атлантычны	1) Балтыйскае мора, заліў Аляска 2) Аравійскае мора, Гудзонаў заліў 3) Чырвонае мора, Бенгальскі заліў 4) Ахоцкае мора, Мексіканскі заліў

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літары і лічбы. Напрыклад: А1.

В5. Выберыце прыродны рэгіён Афрыкі, пазначаны на картасхеме лічбай, для якога ПРАВІЛЬНАЯ характарыстыка:

Пласкагор'е на старажытнай платформе. Перасякаецца рыфтамі. Да разломаў зямной кары прымеркаваны тэктанічныя (рыфтавыя) азёры. Размешчаны патухлы вулкан Кіліманджара.

Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1.




В6. Адзначце тыповых прадстаўнікоў (гл. мал.) прыроднай зоны Аўстраліі, выдзеленай на карце колерам.

Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: 15.



1)	2)	3)	4)	5)
				


В7. Устанавіце адпаведнасць паміж пазначанымі на карце Паўднёвай Амерыкі прыроднымі зонамі і іх характарыстыкамі:



1) ва ўмерана марскім клімаце растуць лясы з букаў і падакарпусаў;
2) вобласць распаўсюджання сухіх цвердалістых лясоў і хмызнякоў з магноліі, мядовай пальмы, персеі (авакада);
3) у тропіках на ўзбярэжжы на шэра-бурых глебах растуць сухія злакі і кактусы;
4) растуць шмат'ярусныя лясы, дрэвы густа перавітыя ліянамі, сярод эпіфітаў шмат архідэй;
5) для жывёл характэрна ахоўная бурая афарбоўка: спіцарогі алень, чырвоная насуха, грывасты воўк, страус нанду; шмат грызуноў, у тым ліку самы буйны ў свеце – капібара.

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар. Напрыклад: А2Б1В4.


В8. Для кліматычнага пояса Паўночнай Амерыкі, пазначанага на карце літарай, ПРАВІЛЬНАЙ з'яўляецца характарыстыка:



1) на працягу года клімат фарміруецца пад уплывам аднаго тыпу паветраных мас;
2) ва ўсходняй частцы пояса выдзяляецца вобласць клімату берагавых пустынь;
3) вільготны тып клімату характарызуецца халоднай зімой (да –25 ºС) і цёплым летам (ад +10 да +24 ºС);
4) на заходнім узбярэжжы выдзяляецца вобласць з міжземнаморскім тыпам клімату;
5) найбольшая колькасць ападкаў у межах пояса выпадае ў цэнтральнай яго частцы.

Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1.

В9. Устанавіце адпаведнасць паміж геаграфічным аб'ектам і яго месцазнаходжаннем на картасхеме ў межах фізіка-геаграфічнага рэгіёна Азіі, пазначанага на картасхеме лічбай:



А) пласкагор'е Дэкан;
Б) пустыня Руб-эль-Халі;
В) Сярэднесібірскае пласкагор'е.
Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар. Напрыклад: А2Б1В4.

В10. Выберыце сцверджанні, якія характарызуюць сацыяльна-эканамічныя і дэмаграфічныя праблемы ў краінах, якія развіваюцца:
1) дэмаграфічнае старэнне;
2) недахоп працоўных рэсурсаў;
3) высокая дзіцячая і мацярынская смяротнасць;
4) нізкі ўзровень пісьменнасці насельніцтва і недастатковы доступ да адукацыі;
5) рэзкае павелічэнне долі насельніцтва ва ўзросце 60–65+ гадоў.
Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: 15.

В11. У характарыстыцы сучаснай сусветнай прамысловасці ПРАВІЛЬНЫМ з'яўляецца сцверджанне:
1) доля здабыўной прамысловасці павялічваецца, доля апрацоўчай зніжаецца;
2) асаблівасць сучаснай геаграфіі здабычы нафты звязана з асваеннем шэльфавых радовішчаў;
3) найбольшую долю электраэнергіі ў свеце выпрацоўваюць ГЭС;
4) у рэгіянальнай структуры вытворчасці чыгуну і сталі вядучая роля належыць Паўночнай Амерыцы;
5) у рэгіянальнай структуры вытворчасці марскіх суднаў вядучая роля належыць Еўропе.
Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1.


В12. Вызначце дзяржаву і яе сталіцу па апісанні:
Дзяржава Паўночнай Еўропы, размешчаная ўздоўж узбярэжжа буйнога паўвострава. Буйны экспарцёр нафты і прыроднага газу, якія здабываюцца на радовішчах у шэльфавай зоне. Валодае багатымі гідраэнергетычнымі рэсурсамі. На ГЭС выпрацоўваецца больш за 90 % спажыванай электраэнергіі. Сталіца дадзенай дзяржавы – … .
У бланк адказаў запішыце толькі назву сталіцы дзяржавы. Напрыклад: Мінск.

В13. У характарыстыцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Індыі ПРАВІЛЬНЫМ з'яўляецца сцверджанне:
1) эканоміка постіндустрыяльнага тыпу;
2) высокі натуральны прырост насельніцтва;
3) пераважае гарадское насельніцтва;
4) развіццё чорнай металургіі грунтуецца на прывазной сыравіне;
5) большую частку сельскагаспадарчай прадукцыі вырабляе жывёлагадоўля.
Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1.

В14. Прачытайце прыведзены ніжэй тэкст, у якім прапушчаны рад слоў. Устаўце на месцы пропускаў словы з прапанаванага спіска, якія падыходзяць па сэнсе. Італія па форме праўлення з'яўляецца А) _____. Займае адну з лідзіруючых пазіцый у рэгіёне па аб'ёме Б) _____. На поўначы краіны размешчаны найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры – Мілан, Турын і В) _____, якія ўтвараюць своеасаблівы «прамысловы трохвугольнік»	**Спісак слоў** 1) парламенцкая рэспубліка 2) парламенцкая манархія 3) здабыча каменнага вугалю 4) выплаўка сталі 5) Генуя 6) Рым

Выбірайце словы паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх на месцы пропускаў у патрэбнай форме. Памятайце, што не ўсе словы могуць быць выкарыстаны для адказу. Кожнае слова можа быць выкарыстана толькі адзін раз. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар. Напрыклад: А2Б1В4.

В15. Адзначце дзяржаву, пазначаную на карце лічбай, якой адпавядае характарыстыка:
Дзяржава ў складзе Брытанскай Садружнасці з гаспадаркай постіндустрыяльнага тыпу. Абмываецца водамі двух акіянаў. Багатая на карысныя выкапні. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва адна з самых нізкіх у свеце.
Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1.



В16. Адзначце АГУЛЬНЫЯ РЫСЫ ў характарыстыцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Вялікабрытаніі і Францыі:
1) федэратыўная форма палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання;
2) постіндустрыяльны тып эканомікі;
3) большая частка электраэнергіі выпрацоўваецца на АЭС;
4) чорная металургія базіруецца пераважна на выкарыстанні імпартнай сыравіны;
5) у сельскай гаспадарцы вядучая роля належыць раслінаводству.
Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад: 15.

В17. Устанавіце адпаведнасць:


Характарыстыка дзяржавы	Дзяржава
А) уваходзіць у тройку сусветных лідараў па здабычы нафты Б) размешчана адна з найбуйнейшых ГЭС свету – Санься В) размешчана адно з найбуйнейшых у свеце радовішчаў жалезных руд – Каражас	1) Канада 2) Кітай 3) Бразілія 4) ЗША

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што не ўсе даныя правага слупка могуць быць пры гэтым выкарыстаны. Напрыклад: А2Б1В4.

В18. Буйны штучны вадаём плошчай воднага люстэрка больш за 100 га, створаны для розных гаспадарчых мэт, – гэта … .
Дапоўніце сказ і запішыце адказ у выглядзе слова ў той форме, у якой яно павінна быць выкарыстана ў сказе.


В19. Выберыце ўзвышша ў Беларусі, пазначанае на картасхеме літарай, для якога ПРАВІЛЬНАЯ характарыстыка:

Сфарміравана прыпяцкім ледавіком. Характэрныя рысы: згладжанасць формаў, вялікае развіццё эразійных працэсаў, выпрацаваныя рачныя даліны з тэрасамі і шырокімі поймамі, затарфаваныя катлавіны ў міжузгоркавых паніжэннях. Пераважаюць вышыні 200–300 м. Найвышэйшы пункт – 345 м.



Адказ запішыце літарай. Напрыклад: А.

В20. Устанавіце адпаведнасць:

Правінцыя	Характарыстыка правінцыі
	1) характэрны раўнінны рэльеф, вялікую тэрыторыю займае Цэнтральнабярэзінская раўніна 2) амаль поўнасцю размешчана ў межах адной дадатнай тэктанічнай структуры 3) сваю назву правінцыя атрымала дзякуючы вялікай колькасці азёр – больш за 3000 4) распрацоўваюцца радовішчы нафты, каменных солей, будаўнічых пяскоў і каменю 5) адсутнічаюць запаведнікі і нацыянальныя паркі

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар. Памятайце, што не ўсе даныя правага слупка могуць быць пры гэтым выкарыстаны. Напрыклад: А2Б1В4.

В21. Прачытайце прыведзены ніжэй тэкст, у якім прапушчаны рад слоў. Устаўце на месцы пропускаў словы з прапанаванага спіска, якія падыходзяць па сэнсе. Найбольшая ўдзельная вага ў горназдабыўной прамысловасці сярод рэгіёнаў прыходзіцца на А) _____ вобласць. Распрацоўваюцца радовішчы Б) _____ – Рэчыцкае, Асташкавіцкае. Здабыча калійных солей вядзецца на В) _____ і Петрыкаўскім радовішчах	**Спісак слоў** 1) Мазырскае 2) Старобінскае 3) нафта 4) каменная соль 5) Віцебская 6) Гомельская

Выбірайце словы паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх на месцы пропускаў у патрэбнай форме. Памятайце, што не ўсе словы могуць быць выкарыстаны для адказу. Кожнае слова можа быць выкарыстана толькі адзін раз. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар. Напрыклад: А2Б1В4.

В22. Выкарыстоўваючы даныя табліцы, разлічыце, на колькі змянілася колькасць насельніцтва краіны за год, калі на пачатак года яна складала 10 млн чалавек.

Агульны каэфіцыент нараджальнасці, ‰	Агульны каэфіцыент смяротнасці, ‰	Колькасць эмігрантаў, тыс. чал.	Колькасць імігрантаў, тыс. чал.
10	5	100	140

Адказ запішыце ў выглядзе цэлага ліку са знакам (+), калі колькасць насельніцтва павялічылася, або са знакам (–), калі колькасць насельніцтва паменшылася. Напрыклад: +50000.